В системе физического воспитания всестороннее развитие личности выражает одну из главных потребностей физического образования – необходимость формирования личности с всесторонне развитыми физическими и духовными способностями. Такие личности играют решающую роль в укреплении социально-экономической мощи нашей страны.

***А.М. Ненадавец, д-р філ. навук, прафесар***
*Філіял БДЭУ (Бабруйск)*

## ФІЛАСОФСКАЕ АСЭНСАВАННЕ ПРАБЛЕМЫ АДВЕЧНАГА ЗЛА

Сіла зла – яна неабмежаваная. І што самае галоўнае, пастаянна папаўняецца. А ўсё адбываецца з-за таго, што на кожную праяву зла заўсёды адклікаецца такое ж самае зло, толькі шматкроць памножанае. Атрымліваецца (і тут мы не з'яўляемся першаадкрывальнікамі), што творачы зло, той, хто гэта робіць, здзяйсняе на зло сабе ў першую чаргу, уводзіць у "зону павышанай рызыкі" сваіх родных і блізкіх. Цікава і іншае, што ён не спыняецца! І гэты аспект таксама амаль некрануты даследчыкамі, не пастаўлены пад пастаянны кантроль. Чалавек зла, хутчэй за ўсё, асеплены непадуладным свядомасці пачуццём "вечнай" помсты. Яна – гэтая помста – сляпая, непадкантрольная і з'яўляецца своеасаблівым вечным рухавіком усяго самага благога на зямлі. Бо з логікі жыцця (праверанай шматлікімі пакаленнямі продкаў) выцякае не што іншае, як наступнае правіла – адно зло закранае другое і г.д. Разважаючы пра помсту, нельга забываць і яшчэ пра адну крыніцу зла – зайздрасць. Яна – чорная, неразважлівая, усёпаглынаючая, палонячая чалавеку душу да самых яе драбніц, не пакідаючы ў ёй нават самай дробязнай схованачкі для нечага добрага, справядлівага.

Не забудземся таксама і пра сацыяльнае зло. Яно ж таксама ў многім спрыяла ўзнікненню і ўзмацненню разбуральных да асноваў любога грамадскага ладу, сілаў зла. І нікога, відаць, не здзіўляе, што адной з адвечных параў, узаемавыключных, але, разам з тым, і не існуючых паасобку, была спрадвечная – праўда – крыўда. Узнікшая недзе ў самых глыбінях, а хочацца ўсё ж сказаць па-іншаму, – зароджаная ля першавытокаў станаўлення чалавецтва, бо так ужо атрымалася, што людзі, нібы самі па сабе, адразу падзяліліся на два вялікія (і ўжо даўным-даўно існуючыя!) класы багатых і бедных – прыхільнікаў крыўды і праўды. Не забываймася і пра тое, што "і праўда, адпаведна, у кожнага была свая, і разумелася ды тлумачылася яна па-рознаму, па-свойму". Тут на першы план выступала ўжо класавае зло, якое паступова фарміравалася ў класавую, антыганістычную нянавісць. Гэта была (ды і зараз застаецца чаго ўжо там нешта выдумваць) настолькі магутная разбуральная сіла, што вяла да руйнавання цэлых палітычных сістэм. І ўсё гэта адбываецца з-за пастаянна ўзрастаючага сацыяльнага зла. У выніку такой бескампраміснай барацьбы паміж капіталізмам і сацыялізмам, загадаў доўга

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by

жыць апошні. Але гэта мы значна пашырыліся ў сваіх разважаннях, пачалі аналізаваць праблему ў глабальным плане, дзе зло ад звычайных слоўных перапалак, абвінавачванняў, заяў і пратэстаў перарасло ў дзеянне "злой сілы" – ваенныя канфлікты, рэвалюцыі, войны. Будзем вяртацца да праблемы лакальнага зла, якое таксама добра давалася ў знакі (ды і да сённяшняга дня даецца) людзям. Як бы чалавек не хацеў, але без зла, на вялікі жаль, амаль не абыходзіцца ягонае жыццё. Проста, зло суправаджае любога з нас, "вылазіць на паверхню" у самы непадыходзячы момант і час. І ў гэтым таксама ўзмацняльнасць зла, яго падвоенасць, патроенасць, страшэнная сіла адмоўна-негатыўнага, як у народзе даволі часта называюць "забіваючага" уздзеяння.

Такім чынам, зло (катэгорыю зла) можна трактаваць зыходзячы з філасофскіх канонаў, і як дзейсную, даволі ваяўнічую сілу і тады адмаўленне ад яго будзе выступаць перад намі не нейкім "заканамерна-натуральным", а своеасаблівай маральна-духоўнай каштоўнасцю. Дарэчы, характэрнай усім далёка не ў раўназначнай прапорцыі. І тут ужо зло ёсць неабходнасць тлумачыць, як нешта самастойнае, самазацвярджальнае, пастаянна прысутнічае ў душах людзей, але "да часу" не абуджанае, не запатрабаванае. Канешне, нараджэнне зла, яго першакрыніцу, узмацняльнік злых намераў, можна знайсці ў эгаізме чалавека (лакальнае), чалавецтва, людзей (глабальнае). Лёгка такую пазіцыю растлумачыць – для "самаадмаўлення" эгаізму зла патрабуецца (першапачатковая ўмова!) яго папярэдняе самасцвярджэнне, каб адмовіцца ад сваёй выключнай волі, па логіцы рэчаў, неабходна спачатку мець яе. Мала гэтага, прыватныя пачаткі і сілы спачатку павінны адасобіцца, "адыйсці" ад агульных, а таму разглядаемых як агульначалавечныя, гуманныя, прынцыпаў і канонаў, і імкнуцца да выключнага валадарства. Відаць, такое разважанне цалкам лагічнае, бо навошта тады было ўзнікаць сусветнай субстанцыі зла, напрыклад, калі адкінуць ідэю перавагі, лідэрства і ўсё таго ж валадарства? Але ж тут неабходна разглядаць яшчэ і іншы аспект – гэтае памкненне магло быць важным і абавязковым, у першую чаргу, для таго, каб зло (прапаведнікі, носьбіты зла) на вопыце змаглі пераканацца ў карэннай няздольнасці свайго самасцвярджэння і (як заканамерны вынік!) злучыцца з агульным пачаткам безумоўнага дабра, усёахапляючага і ўсёпануючага.

***Л.Н. Нямкова***
*Філіял БДЭУ (Бабруйск)*

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ – ВАЖНЫ ФАКТАР ДАСЛЕДАВАННЯ САЦЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Гістарычная аснова фальклора ў тым, што ў ім адлюстроўваюцца гістарычныя падзеі і канкрэтныя асобы, а задача даследчыка ў тым, каб дайсці да рэальнасці, размясціць усе у лагічнай паслядоўнасці.

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by